# КНІГА ПРАРОКА МАЛАХІІ

1 Прарочае слова Госпада Ізраілю праз Малахію.
2 Я палюбіў вас, кажа Гасподзь. А вы кажаце: «у чым
явіў Ты любоў да нас?» - Ці ж Ісаў ня брат Якаву? кажа
Гасподзь; і аднак жа Я палюбіў Якава,
3 а Ісава зьненавідзеў і аддаў горы ягоныя на
спусташэньне, і валоданьні ягоныя - шакалам
пустыні.
4 Калі Эдом скажа: мы спляжаны, але мы адновім
разбуранае, дык Гасподзь Саваоф кажа: яны
пабудуюць, а Я разбуру, і назавуць іх вобласьцю
бязбожнаю, народам, на які Гасподзь угневаўся
назаўсёды.
5 І ўбачаць гэта вочы вашыя, і вы скажаце:
узьвялічыўся Гасподзь над межамі Ізраіля!
6 Сын шануе бацьку і раб - гаспадара свайго; калі Я -
бацька, дык дзе пашана да Мяне? і калі Я - Гасподзь,
дык дзе багавейнасьць перад Мною? кажа Гасподзь
Саваоф вам, сьвятары, якія няславіце імя Маё. Вы
кажаце: чым мы няславім імя Тваё?
7 Вы прыносіце на ахвярнік Мой нячысты хлеб, а
кажаце: чым мы няславім Цябе? - тым, што кажаце:
трапеза Гасподняя ня вартая павагі.
8 І калі прыносіце ў ахвяру сьляпое, ці ж ня блага
гэта? альбо калі прыносіце кульгавае і хворае, ці ж
ня блага гэта? Паднясі гэта твайму князю; ці будзе
ён задаволены табою і ці ласкава прыме цябе? кажа
Гасподзь Саваоф.
9 Дык вось, малецеся Богу, каб зьлітаваўся з нас; а
калі такое зыходзіць з рук вашых, дык ці ж можа Ён
ласкава прымаць вас? кажа Гасподзь Саваоф.

10 Лепей хто-небудзь з вас замкнуў бы дзьверы, каб
дарма ня трымалі агню на ахвярніку Маім. Няма
Майго ўпадабаньня да вас, кажа Гасподзь Саваоф, і
прынашэньні з рук вашых не да спадобы Мне.
11 Бо ад усходу сонца да заходу вялікае будзе імя Маё
сярод народаў, і на ўсякім месцы будуць прыносіць
фіміям імю Майму, чыстую ахвяру; вялікае будзе імя
Маё сярод народаў, кажа Гасподзь Саваоф.
12 А вы ганіце яго тым, што кажаце: трапеза
Госпадняя ня вартая павагі, і прыбытак ад яе - ежа
нікчэмная.
13 Пры гэтым кажаце: вось колькі працы! і
заняхайваеце яе, кажа Гасподзь Саваоф, і прыносіце
крадзенае, кульгавае і хворае, і гэтакай самай якасьці
прыносіце хлебны дарунак: ці ж магу з упадабаньнем
прымаць гэта з рук вашых? кажа Гасподзь.
14 Пракляты ілжывец, у якога ў статку ёсьць
несапсаваны самец, і ён даў абяцаньні, а прыносіць
у ахвяру Госпаду пашкоджанае: бо Я цар вялікі, і імя
Маё страшнае ў народаў.

# Мал 2

1 Дык вось, вам, сьвятары, гэтая запаведзь:
2 калі вы не паслухаецеся, і калі ня прымеце да
сэрца, каб узносіць славу імю Майму, кажа Гасподзь
Саваоф, дык я пашлю на вас праклён і пракляну вашыя
дабраславеньні, і ўжо праклінаю, бо вы ня хочаце
прыкласьці да гэтага сэрца.
3 Вось, Я адбяру ў вас лапатку, і памёт раскідаю на
твары вашыя, памёт сьвяточных ахвяраў вашых, і
выкінуць вас разам зь ім.
4 І вы ўведаеце, што Я даў гэтую запаведзь на
захаваньне запавету Майго зь Лявіем, кажа Гасподзь
Саваоф.

5 Запавет Мой зь ім быў запавет жыцьця і міру, і Я
даў яго яму дзеля страху, і ён баяўся Мяне і трымцеў
перад імем Маім.
6 Закон праўды быў у вуснах ягоных, і няпраўды ня
было на языку ў яго; у міры і ў праўдзе ён хадзіў са
мною і многіх адвярнуў ад грэху.
7 Бо вусны сьвятара павінны захоўваць веды, а закону
шукаюць ад вуснаў яго, бо ён весьнік Госпада Саваофа.
8 Але вы ўхіліліся ад гэтай дарогі, многія паслужылі
спакусай у законе, разбурылі запавет Лявія, кажа
Гасподзь Саваоф.
9 За гэта і Я зраблю вас пагарджанымі і прыніжанымі
перад усім народам, бо вы не ідзяце шляхамі Маімі,
крывадушнічаеце ў справах закону.
10 Ці ж не адзін ва ўсіх нас Бацька? Ці ж не адзін
Бог стварыў нас? Чаму ж мы вераломна дзеем
адзін супроць аднаго, парушаючы тым самым запавет
бацькоў нашых?
11 Вераломна ўчыняе Юда, і мярзота чыніцца ў Ізраілі
і ў Ерусаліме; бо прынізіў Юда сьвятыню Гасподнюю,
якую любіў, і ажаніўся з дачкою чужога бога.
12 У таго, хто робіць гэта, зьнішчыць Гасподзь
з намётаў Якаўлевых таго, хто чувае на варце і
адказвае, і прыносіць ахвяру Госпаду Саваофу.
13 І вось, што яшчэ вы робіце: вы прымушаеце
паліваць сьлязьмі ахвярнік Госпада з галашэньнем
і лямантам, так што Ён ужо не глядзіць болей на
прынесенае і ня прымае ўмілажальвальнай ахвяры з
рук вашых.
14 Вы скажаце: за што? За тое, што Гасподзь быў
сьведка паміж табою і жонкай маладосьці тваёй,
супроць якой ты ўчыніў вераломства, тым часам як
яна сяброўка твая і законная жонка твая.
15 Але ці ж не зрабіў таго самага адзін, і ў ім жыў

выдатны дух? Што ж зрабіў гэты адзін? Ён хацеў
атрымаць ад Бога нашчадкаў. Дык вось, захоўвайце
дух ваш, і ніхто хай ня робіць вераломна супроць
жонкі і маладосьці сваёй.
16 Калі ты ненавідзіш яе, адпусьці, кажа Гасподзь Бог
Ізраілеў; крыўда пакрые вопратку яго, кажа Гасподзь
Саваоф; таму сачэце за духам вашым і не рабеце
вераломна.
17 Вы гневаеце Госпада словамі вашымі і кажаце: чым
гневаем мы Яго? Тым, што кажаце: кожны, хто
чыніць ліха, добры перад вачыма Госпада, і да такіх
Ён мае ўпадабаньне, альбо: дзе Бог правасудзьдзя?

# Мал 3

1 Вось, Я пасылаю анёла Майго, і ён падрыхтуе
шлях перад Мною, і нянаджана прыйдзе ў храм Свой
Гасподзь, Якога вы шукаеце, і анёл запавету, якога вы
жадаеце; вось, ён ідзе, кажа Гасподзь Саваоф.
2 І хто вытрымае дзень прышэсьця Яго, і хто ўстоіць,
калі Ён явіцца? Бо Ён - як агонь, што расплаўляе, і як
шчолак, што ачышчае,
3 і сядзе пераплаўляць і ачышчаць срэбра, і ачысьціць
сыноў Левія і пераплавіць іх, як золата і як срэбра, каб
прыносілі ахвяру Госпаду ў праўдзе.
4 Тады даспадобы будзе Госпаду ахвяра Юды і
Ерусаліма, як у дні старадаўнія і як у гады ранейшыя.
5 І прыйду да вас судзіць і буду хутка выкрываць
чарадзеяў і пералюбцаў, і тых, якія прысягаюць
ілжыва і забіраюць плату ў найміта, уціскаюць удаву і
сірату і адпіхваюць прыхадня, і Мяне не баяцца, кажа
Гасподзь Саваоф.
6 Бо Я - Гасподзь, Я не мяняюся; і тады вы, сыны Якава,
ня зьнішчыліся.
7 Зь дзён бацькоў вашых вы адступіліся ад пастановаў
Маіх і ня трымаецеся іх; зьвярнецеся да Мяне, і Я

зьвярнуся да вас, кажа Гасподзь Саваоф. Вы скажаце:
як нам зьвярнуцца?
8 Ці можна чалавеку абкрадваць Бога? А вы
абкрадваеце Мяне. Скажаце: чым абкрадваем мы
Цябе? дзесяцінаю і прынашэньнямі.
9 Праклёнам вы праклятыя, бо вы - увесь народ -
абкрадваеце Мяне.
10 Прынясеце мне дзесяціны ў дом сховішча, каб у
доме Маім была ежа, і хоць бы ў гэтым выпрабуйце
Мяне, кажа Гасподзь Саваоф: ці не адчыню Я вам
адтулін нябесных і ці ня выльлю на вас дабраслаўленьня
да краю?
11 Я ў вас забараню пажыральнікам зьнішчаць
вашыя плады зямныя, і вінаградная лаза на полі
не пазбудзецца пладоў сваіх, кажа Гасподзь Саваоф.
12 І шчаснымі называцьмуць вас усе народы, бо вы
будзеце зямлёю бажавольнаю, кажа Гасподзь Саваоф.
13 Дзёрзкія прад Мною словы вашыя, кажа Гасподзь.
Вы скажаце: што мы гаворым супроць Цябе?
14 Вы кажаце: марнае служэньне Богу, і якая
карысьць, што мы трымаліся пастановаў Яго і
хадзілі ў жалобнай вопратцы прад абліччам Госпада
Саваофа?
15 І сёньня мы лічым пагардлівых шчасьлівымі: лепей
уладжваюцца тыя, якія робяць беззаконна, і хоць
спакушаюць Бога, але застаюцца цэлыя.
16 Тыя, што не баяцца Бога, кажуць адно аднаму:
уважае Гасподзь і чуе гэта, і прад абліччам Яго
пішацца памятная кніга пра тых, што баяцца Госпада
і шануюць імя Яго.
17 І яны будуць Мае, кажа Гасподзь Саваоф,
уласнасьцю Маёю ў той дзень, які Я зраблю, і
буду літаваць іх, як літуе чалавек сына свайго, што
служыць яму.

18 І тады зноў убачыце розьніцу паміж праведнікам
і бязбожным, паміж службітом Бога і няслухам
Ягоным.

# Мал 4

1 Бо вось, прыйдзе дзень, палкі як печ: тады ўсе
пагардлівыя бязбожначынцы будуць як салома, і
папаліць іх прыйшлы дзень, кажа Гасподзь Саваоф,
так што не пакіне ў іх ні кораня, ні вецьця.
2 А вам, любабаязныя перад імем Маім, узыдзе сонца
праўды і ацаленьні ў праменьні Ягоным, і выйдзеце
вы і забушуеце, як цяляты ўкормленыя;
3 і будзеце таптаць бязбожных, бо яны будуць пылам
пад ступакамі ног вашых у той дзень, які Я зраблю,
кажа Гасподзь Саваоф.
4 Памятайце закон Майсея, раба Майго, які Я наказаў
яму, на Харыве ўсяму Ізраілю, гэтак сама як і правілы
і пастановы.
5 Вось, я пашлю да вас Ільлю прарока перад
наступленьнем дня Госпадняга, вялікага і страшнага.
6 І ён паверне сэрцы бацькоў да дзяцей і сэрцы дзяцей
да бацькоў іхніх, каб Я, прыйшоўшы, не пакараў
зямлю праклёнам.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 21 Feb 2024 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc